# СВАБОДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА № 3 (101), 24-30. 1. 2008 г.

# ВЯЗНІ СУМНЕННЯЎ

## ПЕРАМАГАЦЬ ТРЭБА НЕ ЎЛАДУ, А САМІХ СЯБЕ

**Чарговая акцыя пратэсту прадпрымальнікаў была не такой шматлюднай, як папярэдняя. З аб'ектыўных прычынаў: большасць лідэраў руху гэтым часам сядзела за кратамі.**




**Прадпрымальнікі каля** *прыступак Палаца Рэспублікі. Мінск, 21 студзеня, 2008 году. Фота газеты "Свабода".*

Аднак нават 10 студзеня, калі ўсе яшчэ былі на волі, поспех быў досыць абмежаваны. Так, з аднаго боку, прадпрымальнікі рашуча прыйшлі на Кастрычніцкую плошчу і потым наладзілі маніфестацыю каля Дома Ураду. Але ж было іх, паводле самых аптымістычных падлікаў, каля 5 тысяч.

Між тым, ад сумна вядомага указу №760 пацярпела каля 64 тысяч індывідуальных прадпрымальнікаў. А ёсць жа яшчэ іх наёмныя працаўнікі і родныя. Высвятляецца, што да актыўнага пратэсту гатовыя, лічы, некалькі адсоткаў.

Гэта можна патлумачыць тым, што людзі зняверыліся. Сапраўды, шмат гадоў улада робіць практычна ўсё па уласным сцэнары, не надта зважаючы на інтарэсы грамадства і, тым больш, яго асобных груповак. На вулічныя акцыі яна звычайна рэагуе жорстка, даводзячы, што пратэстамі можна толькі пагоршыць сваё становішча. У выніку большасць тых, чые інтарэсы закранутыя, пагаджаецца на ролю пацучкоў, якія мусяць шукаць чарговую шчыліну, каб схавацца ад кіпцюроў дзяржавы.

Пачуццё годнасці з беларусаў вынішчалі стагоддзямі. І таму цяжка разлічваць на тое, што яно абудзіцца зараз, у перыяд агульнай апатыі. Аднак, калі спасылацца на гістарычныя перадумовы, то лепей адразу ўзняць рукі дагары.

Ва Украіне таксама жыццё было не цукар. Аднак тамтэйшы люд знайшоў у сабе дас-

Заканчэнне на стар.5

## ПРАЎДА ПРА БЕЛАРУСКІХ ГАСТАРБАЙТЭРАЎ

НА СТАР.5

## ЦІ МОЖНА ЧАКАЦЬ У БЕЛАРУСІ ПАЎТАРЭННЯ ВЯСНЫ-2006?

ВАШЫ АДКАЗЫ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ

# ХТО ДЛЯ ВАС КАСТУСЬ КАЛІНОЎСКІ?

## 2 ЛЮТАГА СПАЎНЯЕЦЦА 170 ГАДОЎ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ГЕРОЯ

**МІКОЛА СТАТКЕВІЧ, САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ “НАРОДНАЯ ГРАМАДА”:**

### “УВАСАБЛЕННЕ ГОНАРУ”

Кастусь Каліноўскі для мяне – гэта ўвасабленне гонару, асабістай мужнасці, прыкладу лідэрства і любові да Беларусі. Гэта чалавек, які здолеў прайсці свой шлях да канца.

**ПЁТРА, ТАКСІСТ:**

### “ІДЭАЛ БЕЛАРУСКАГА ЗМАГАРА”

Для мяне гэта ідэал беларускага змагара. Чалавек, які ў сваім змаганні быў гатовы ісці да канца. Сёння такіх людзей няма. Усе гатовыя ісці да пэўнай мяжы.

**ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ, МАЛАДЗЁВЫ ЛІДЭР:**

### “УЗОР САМААХВЯРНАГА ЗМАГАННЯ”

Кастусь Каліноўскі – гэта ўзор самаахвярнага змагання. Каліноўскі, які аддаў сваё жыццё за Радзіму ў 26 гадоў, а кіраваў паўстаннем у 24. Гэта, напэўна, узор для кожнага маладафронтаўца. Для мяне гэта шмат значыць.

**ВАСІЛЬ, БЕСПРАЦОЎНЫ:**

### “БЕЛАРУСКІ ЯМЕЛЬКА ПУГАЧОЎ”

Для мяне гэта “бальшавік самы настаяшчы”. Беларускі Ямелька Пугачоў. Ці не Каліноўскі заклікаў, каб рука з сякераю не спынялася над калыскай шляхецкага дзіцяці? Лепш не ўяўляць, што было б, калі б паўстанне перамагло. Сапраўдная крывавая дыктатура. Таму ягоны эшафот – найлепшы канец для гісторыі. Будучы дыктатар, не паспеўшы “пакіраваць”, атрымаў вянок пакутніка і героя. А нашчадкі займелі міфічнага змагара за волю.

**НАСТА ПАЛАЖАНКА, МАЛАДЗЁВАЯ АКТЫВІСТКА:**

### “ДЛЯ МЯНЕ ГЭТА СІМВАЛ НАДЗЕІ”

Для мяне гэта прыклад мужнасці, непахіснасці. У 2008 годзе для мяне гэта сімвал надзеі. Гэта напамін пра “плошчу Кастуся Каліноўскага” ў Мінску ў 2006-м. Ну, і напэўна, напамін пра адказнасць перад будучыняй.

**АНДРАНІК АНТАНЯН, ЛІТАРАТАР:**

### “АДЗІН СА ШМАТЛІКІХ”

Кастусь Каліноўскі -- адзін са шматлікіх дзеячоў паўстання 1863 году. Мізэрнага па выніках, жахлівага па наступствах. З пазіцыяў сённяшняга дня тое ваеннае выступленне выглядае фальстартам, які спарадзіў на нашых землях Галакост. Калі адкінуць прыгожыя лозунгі, якімі аздоблены падзеі тых гадоў у беларускай гістарыяграфіі, мы ўбачым, што культурнае і эканамічнае адставанне, з якімі Беларусь і Літва прамаршыравалі праз XX стагоддзе, было запраграмаванае менавіта ў 1863 годзе. Пакуль у беларускіх фальварках трацілі грошы на зброю, каб потым пад воклічы "Пан за пана хавайся" страціць усё, у Латвіі і Эстоніі рыхтаваліся да першых агульнанацыянальных святаў песні.

**ГЕНАДЗЬ ЛОЙКА, МАСТАК:**

### “РЫЦАР НАЦЫІ”

Я неяк рабіў тры партрэты. У адным картушы тры выявы, трох беларускіх рыцараў. Гэта Пазьняк, Караткевіч і Каліноўскі. Для мяне ён рыцар нацыі. Ваяр. Мужчына. Мы мала пра яго ведаем, як пра чалавека. Таму ён застаўся чыстым сімвалам.

**ТАЦЯНА, НАСТАЎНІЦА:**

### “МУЖЫК, ЯКІХ СЁННЯ НЕ РОБЯЦЬ”

Мужык. Такі, якіх сёння чамусьці не робяць. Малады. Прыгожы. Здольны ўзяць усю адказнасць на сябе. І заплаціць па поўным рахунку.

**АРТУР КЛІНАЎ, МАСТАК, РЭДАКТАР ЧАСОПІСА “ПАРТЫЗАН”:**

### “НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГЕРОЙ”

Каліноўскі для мяне, у пэўным сэнсе, ідэальнае ўвасабленне вобраза беларускага партызана. Гэта рэальны нацыянальны герой. Беларускі партызан у самым высокім яго разуменні.

**ВАЛЯНЦІН АКУДОВІЧ, ФІЛОСАФ:**

### “Я ЯМУ ЎДЗЯЧНЫ”

Я нарадзіўся і вырас у мястэчку Свіслач, дзе ў Свіслацкай вучэльні, што паўстала на базе гімназіі, вучыўся Кастусь Каліноўскі. Да таго ж, я скончыў школу імя Каліноўскага. Больш за тое, я хадзіў у школу кожны дзень каля бюста Каліноўскага. Так што, повязь у мяне з Кастусём Каліноўскім з дзяцінства. Разам з тым, хоць ён прысутнічаў у жыцці штодня, у школе ў тыя часы лішні раз увагу на гэтым не акцэнтавалі. Я не памятаю, каб мы вывучалі яго біяграфію, каб у нас быў музейчык Каліноўскага ці нешта такое. Хоць Каліноўскі быў адзіны дазволены герой беларускай мінуўшчыны. Сёння адносна Каліноўскага ёсць розныя меркаванні. З аднаго боку, гэта рамантычны герой беларускай гісторыі. Яму належыць адно з першых месцаў у пантэоне тых, хто ствараў беларускую нацыю. Ёсць і абсалютна іншая ацэнка яго, як будучага тырана, што гатовы быў ужываць самыя радыкальныя метады для дасягнення сваіх задач. Але ж, якая б пазіцыя адносна яго ні была слушная, Каліноўскі варты і будзе адным з галоўных герояў самага рамантычнага перыяду паўставання беларускай нацыі. Я не выключаю, што сам вярнуўся ў свой час да беларушчыны, пасля свайго абрасейвання, з-за гэтай глыбокай экзістэнцыйнай повязі з Каліноўскім, якая ў мяне была з самага дзяцінства. Я не скажу, што ў мяне ёсць сімпатыі, але само адчуванне беларускасці ўва мне сфармаваў, у першую чаргу, Кастусь Каліноўскі. І я яму за гэта ўдзячны. Персанальна.

# Адным абзацам



**23-га студзеня з калоніі ў Шклове быў вызвалены Зміцер Дашкевіч.** Як піша газета “Наша Ніва”, вызваленне для яго было поўнай нечаканасцю. Нібыта прыйшла пастанова, што тэрмін зняволення — паўтара году — зменшылі да году, і такім чынам Зміцер пераседзеў чатыры месяцы. У лістападзе 2006 году Зміцер Дашкевіч быў асуджаны на паўтара году зняволення за ўдзел у незарэгістраванай арганізацыі. На волю ён меўся выйсці сёлета 15 сакавіка. Прыканцы мінулага году яго дадаткова судзілі ў калоніі за неданясенне на паплечнікаў, але тэрмін не павялічылі.

**22 студзеня ў судах Маскоўскага і Цэнтральнага раёна Мінска адбыліся суды над затрыманымі напярэдадні ўдзельнікамі акцыі пратэсту індывідуальных прадпрымальнікаў, якія выступалі супраць прэзідэнцкага ўказа №760.** Затрыманнямі кіраваў асабіста міністр унутраных справаў РБ Навумаў. Усяго былі затрыманыя больш за дваццаць чалавек. Сямёра з іх былі пакараныя “суткамі” (ад 5-ці да 15-ці). Астатнія атрымалі агромністыя штрафы. Падчас папярэдняй маніфестацыі ў Мінску 10 студзеня пад арыштам апынуліся большасць яе арганізатараў. Усяго за кратамі цяпер каля 60 чалавек

**22 студзеня ў ЗША былі абвешчаныя прэтэндэнты на прэмію “Оскар”, якую Амерыканская кінаакадэмія ўручае штогод за лепшыя дасягненні ў кінамастацтве.** Сярод іншых, былі названыя і прэтэндэнты на лепшы замежны фільм мінулага году. Адным з фаварытаў лічыцца фільм польскага кінарэжысёра Анджэя Вайды “Катынь”. Стужка прысвечаная трагедыі 1940-га году, калі НКВД расстраляў пад Смаленскам звыш чатырох тысяч палонных польскіх афіцэраў (сярод іх былі і этнічныя беларусы). Яшчэ адным прэтэндэнтам на Оскара названы фільм расійскага рэжысёра Мікіты Міхалкова “12” – перароблены пад расейскую сучаснасць даўні шэдэўр амерыканскага кіно “Дванаццаць разлзлаваных мужчын”.




**Анджэй Вайда** *на прэс-канферэнцыі ў Варшаве з нагоды намінацыі на прэмію «Оскар». Фота з сайта gazeta.pl*

# Суседзі

## ЗНАЁМЦЕСЯ: РЭЦЭСІЯ

На пачатку гэтага тыдня адбыўся абвал на сусветных фондавых рынках. Пазней сітуацыя на рынках Азіі і Еўропы амаль стабілізавалася. Але рынкі ў Расіі працягвае ліхаманіць. Аб тым, чаго можна чакаць у бліжэйшай будучыні, распавёў расійскай службе Радыё Свабода прафесар Стэнфардскага ўніверсітэта Міхаіл Бернштам.

Паводле яго словаў, зніжэнне Федэральнай рэзервавай сістэмай ЗША ўліковай стаўкі на тры чвэрці працэнта змякчыла паніку на біржах, але вялікай карысці гэта не прынясе, бо «крызіс адбываецца ў банкаўскім сектары, на крэдытных рынках. Усякае зніжэнне працэнта вядзе толькі да павелічэння грашовай масы…» Прафесар Бернштам прадказвае, што ў гэтых умовах даляр будзе падаць: «Можна сказаць, што будзе працягвацца павольнае падзенне і можа, увогуле, дайсці да 1,5 даляра за еўра».

Як гэтая сітуацыя можа адбіцца на звычайных грамадзянах – напрыклад, у ЗША і ў Расіі?

«У Злучаных Штатах, — кажа М.Бернштам, — будзе адчувацца рост беспрацоўя, за кошт падзення заробнай платы – то бок, інфляцыя будзе перавышаць рост зарплаты, будзе зніжацца даход насельніцтва. Калі будзе рэцэсія (падзенне валавога ўнутранага прадукту) 1,5-2% за год, то, адпаведна, сярэдні даход насельніцтва таксама зменшыцца на 1,5-2%. У Расіі палова бюджэту залежыць ад цэнаў на прыродныя рэсурсы, перш за ўсё, ад цаны на нафту. Ва ўмовах сусветнай рэцэсіі ці зніжэння эканамічнага росту будзе скарачацца расійскі бюджэт. Пацерпяць бюджэтнікі, пенсіі, ахова здароўя…Цэны на нафту ў бліжэйшай будучыні, хутчэй за ўсё, упадуць. Калі Амерыка ўваходзіць у рэцэсію, скажам, на 2%, сусветныя цэны на нафту падаюць на 5%», — прагназуе амерыканскі прафесар.

**Аглядальнік**

# Каментар

# РЫКАШЭТ

## ПАМІЖ ДАНІЯЙ І ІРАНАМ

“Іранскі суд прысудзіў кіраўніку федэрацыі настаўнікаў Ірана тры гады турмы за знявагу прарока Мухамеда. Настаўнік быў арыштаваны ў сакавіку 2007 году за ўдзел у падрыхтоўцы экзаменацыйных пытанняў, якія былі прызнаныя недастаткова паважлівымі да прарока”. Якое дачыненне мае нядаўняе паведамленне агенцтва Рэйтэрз да Беларусі?

Мяркуйце самі. На мінулым тыдні гарадскі суд у Мінску прысудзіў былому намесніку галоўнага рэдактара газеты “Згода” тры гады калоніі ўзмоцненага рэжыму. За тое, што зімою 2006 году ён перадрукаваў карыкатуры на прарока Мухамеда. У дацкай газеце “Юландс-постэн”, якая першай іх апублікавала, жахнуліся прысуду ў Мінску. Тыя карыкатуры друкаваліся ўжо ў дзясятках краінаў, у тым ліку, мусульманскіх. У многіх рэлігійныя фанатыкі справакавалі былі



**А.Здзвіжкоў у судзе** *падчас вынясення прысуду. Мінск, 18 студзеня 2008 году.*

масавыя хваляванні. Але ні ў воднай краіне свету дагэтуль за карыкатуры не саджалі.

Дацкі саюз журналістаў выказаў глыбокую занепакоенасць вынікамі суду. Прадстаўнік АБСЕ ў справах свабоды СМІ Міклаш Харашці назваў прысуд несувымерным “злоўжываннем законам аб распальванні рэлігійнай варожасці”. Абурыліся і іншыя міжнародныя праваабарончыя арганізацыі.

У самой Беларусі ў абарону Здзвіжкова выступілі толькі журналісты БАЖ. А таксама адзін з прадстаўнікоў беларускіх мусульманаў. Большасць вернікаў гэтай і іншых рэлігійных канфесіяў нашай краіны рэагавалі, як належыць. Без фанатызму. Не Іран усё ж такі.

У 1979-м годзе іранскія маджахеды (сярод іх быў малады Ахмадзінежад) захапілі ў Тэгеране пасольства ЗША і шмат месяцаў трымалі ў закладніках дыпламатаў і персанал.

Тады нехта параўнаў правадыра ісламскай рэвалюцыі ў Іране аяталу Хамейні з куляй, якая вылецела з XII-га стагоддзя і патрапіла ў XX-е. Рыкашэтам яна заляцела і ў XXI-е.

Ці ёсць нешта агульнае паміж цяперашнімі Іранам і Беларуссю? Ды нічога. Як і паміж дзяржаўнай ідэалогіяй РБ і хрысціянствам.

**Рэдактар**

# “НАЖНІЦЫ КУДРЫНА”

## ВЕСТКІ З ЭКАНАМІЧНЫХ ФРАНТОЎ

### ГРАНДЫЁЗНЫЯ ПЛАНЫ ПРЫВАТЫЗАЦЫІ

«Грандыёзныя планы ўраду” ў галіне прыватызацыі ў 2008 годзе агучыў начальнік галоўнага ўпраўлення бюджэтнай палітыкі Міністэрства фінансаў Максім Ермаловіч. Паводле яго словаў, паступленні ў бюджэт за кошт продажу дзяржаўнай уласнасці складуць 8 мільярдаў беларускіх рублёў. Гэта без уліку даходаў ад продажу акцыяў “Белтрансгаза”.

Чалавека недасведчанага гэтая лічба можа ўразіць. Але не будзем забываць, што чарговым “траншам” за акцыі «Белтрансгаза» (12,5%) дзяржава атрымае ад расійскага «Газпрома» 625 мільёнаў даляраў. А за ўсю астатнюю маёмасць, якую плануецца прадаць, — 3,72 мільёна. Што ў 168 разоў меней.

Усё б нічога, калі б усе прадпрыемствы і аб’екты, якія лічацца дзяржаўнай маёмасцю, прыносілі прыбытак. Тады іх і прадаваць не было б патрэбы. Але ў рэальнасці ўсё інакш. Таму дзяржава ў нашым выпадку, у сваім далёка не заўсёды апраўданым памкненні кантраляваць усё і ўсіх, прыпадабняецца славутаму сабаку на сене. Назваць гэта эфектыўнай эканамічнай палітыкай нельга нават з вялікай нацяжкай. Але нічога мяняць у цяперашнім становішчы ўлада, выглядае, не збіраецца.

А пакуль што неразваротлівая гаспадарка РБ датуецца звонку. І аб гэтым сведчаць лічбы. Знешняя пазыка расце год ад году. Летась яна павялічылася амаль утрая — з 800 мільёнаў до 2,3 мільярда даляраў. У адпаведнасці з законам аб бюджэце на 2008 год ліміт дзяржаўнай пазыкі павялічаны ўжо да 6 мільярдаў даляраў.

Адказ на пытанне, ці можна ўвесь час жыць на пазыку, відавочны. Рана ці позна крэдыторы запатрабуюць плаціць па векселях.




**Рабочыя АЗС** *вымяраюць колькасць бензіну ў сховішчы. Мінск, студзень 2008 году.*

### ЗА ЎСЁ ЗАПЛАЦЯЦЬ КІРОЎЦЫ?

Магчыма, кошт бензіну ў Беларусі хутка зноў вырасце. У тым выпадку, калі наверсе атрымае падтрымку ініцыятыва Міністэрства транспарту РБ – улучыць у кошт паліва падатак за карыстанне аўтамабільнымі дарогамі.

Прапануючы такую схему, Мінтранс спасылаецца на практыку некаторых еўрапейскіх краінаў. “У свеце з аднаго літра бензіну ці дызельнага паліва ад 25 да 60 цэнтаў ідзе плата за карыстанне дарогамі”, — так патлумачыў пазіцыю свайго ведамства на пасяджэнні Савета міністраў міністр транспарту Уладзімір Сасноўскі.

А ўладальнікі аўтамабіляў у Беларусі практычна вызваленыя ад платы за карыстанне дарогамі, – паскардзіўся Сасноўскі.

Сабраныя з дапамогай такога дарожнага падатку сродкі, мауляў, пойдуць на рамонт аўтадарог ва ўсёй краіне.

Аднак, ёсць адно “але”, пра якое міністр або не ведае, або не захацеў згадваць. Справа ў тым, што ў кошт аўтамабільнага паліва, якое прадаецца на АЗС Беларусі, ужо ўлучаны падатак, які спраўна пералічваецца ў бюджэт. І складае ён 55% кошту паліва. То бок – больш за палову.

Дадамо сюды яшчэ адсутнасць экспартнага мыта на нафту для ўнутранага спажывання. Расія вызваліла ад яго РБ (мытам абкладаецца толькі тая нафта, якая перапрацоўваецца ў нашай краіне і экспартуецца далей). Атрымліваецца, наша дзяржава і без таго мае немалы прыбытак за кошт гандлю бензінам і дызпалівам.

Але Мінтранс хоча зноў узняць цану. Ці будзе тады паліва па кішэні большасці беларускіх аўтамабілістаў? Бо, спасылаючыся на еўрапейскую практыку, айчынныя чыноўнікі не ўлічваюць розніцу ў даходах грамадзянаў краінаў ЕЗ і нашых суграмадзянаў.

### «НАЖНІЦЫ КУДРЫНА» І БЕЛАРУСКІЯ НПЗ

Ад 1 лютага ўрад Расіі падвышае мыта на экспарт нафты да рэкордных 333,8 даляра за тону.

У самой Расіі сістэма экспартнага мыта атрымала назву «нажніц Кудрына», паводле прозвішча іх распрацоўніка – міністра фінансаў РФ Аляксея Кудрына. Сэнс мыта просты: прымусіць нафтавыя кампаніі падзяліцца сваімі звышпрыбыткамі з дзяржбюджэтам.

Мыта на экспарт нафты і нафтапрадуктаў з РФ пераглядаецца ўрадам раз на два месяцы на падставе маніторынгу цэнаў на расійскую нафту маркі Urals на сусветных рынках. Летась «нажніцы Кудрына» прайшліся і па беларускіх НПЗ, істотна знізіўшы іх рэнтабельнасць. Рэч у тым, што ў адпаведнасці з беларуска-расійскім пагадненнем стаўкі мыта на нафту і нафтапрадукты ў РБ вызначаюцца ў аднолькавым памеры з расійскімі. І ўводзіцца яны павінны ў тыя ж тэрміны, што і ў Расіі.

Сёлета змянілася і размеркаванне даходаў з мытаў на экспарт нафты. Калі летась яны размяркоўваліся паводле формулы 30% Беларусі і 70% — у бюджэт Расіі, дык цяпер суадносіны – 20% і 80%.

Так што ад 1 лютага стаўкі мыта на экспарт нафты вымушаны будзе ўзняць і ўрад РБ.

Аналітыкі прадказваюць зніжэнне сусветных цэнаў на нафту. Што ў спалучэнні з уводам у дзеянне рэкорднай стаўкі расійскага мыта на экспарт сыравіны крыху пагоршыць і фінансавыя паказчыкі нафтавых кампаніяў. Адаб’ецца гэта і на беларускіх НПЗ, якія вымушаныя будуць прадаваць паліва танней, а плаціць за яго (з улікам мыта) даражэй.

Прынамсі, паводле такога сцэнару сітуацыя развівалася на пачатку мінулага году, калі “нажніцы Кудрына” істотна падрэзалі даходы ад перапрацоўкі нафты ў Беларусі.

**Агляд падрыхтаваў**
**Алег Ман**

# ВЯЗНІ СУМНЕННЯЎ

## ПЕРАМАГАЦЬ ТРЭБА НЕ ЎЛАДУ, А САМІХ СЯБЕ

**Заканчэнне. Пачатак на стар.1**

таткова волі, каб выйсці на Майдан. Хаця існавала рызыка, што ўлады ўжывуць супраць дэманстрантаў нават зброю.

Беларусаў дагэтуль трымаюць на каленях нават не гумавыя дручкі, а ўласныя сумненні і звычка. Перамагаць трэба найперш не ўладу, а саміх сябе.

Гэта, канечне, не адзіная праблема. Нават тыя, хто набраўся смеласці выйсці на вуліцы з пратэстам, выглядалі разгубленымі. "Што рабіць?" – пыталіся людзі 10 студзеня на плошчы Незалежнасці ў сваіх лідэраў. І не чулі канкрэтнага адказу.

У гэтым яшчэ адна перавага ўлады: яна дакладна ведае, чаго хоча. І ейныя дзеянні збольшага прадказальныя. 21 студзеня старшыня федэрацыі хакея Уладзімір Навумаў асабіста ўжыў супраць прадпрымальнікаў сілавы прыём (прабачце, зусім забыў нагадаць, што ён яшчэ па сумяшчальніцтве ўзначальвае Міністэрства ўнутраных справаў).

Хаця ва ўладных структурах сітуацыя таксама не аднародная. У Гродне мясцовы мэр Аляксандр Антоненка асабіста прыйшоў на мітынг і гаварыў там з прадпрымальнікамі. Наўрад ці тая гутарка дасць вялікі плён, аднак ужо тое, што да ўдзельнікаў акцыі пратэсту паставіліся як да людзей, а не як да "адмарозкаў", чагосьці каштуе.

Выглядае, што Беларусь падсвядома рыхтуецца да пераменаў. Але, каб яны наступілі, патрэбная пэўная крытычная маса. Тая, што існуе сёння, пакуль недастатковая. І цяпер пытанне палягае ў наступным: ці будзе яна павялічвацца ці паступова расцярачэцца і тое, што ёсць?

Адказ у пэўнай ступені залежыць ад кожнага з нас. Альбо сённяшні сярэднявечны стан грамадзянскіх правоў нас задавальняе. Ці, прынамсі, турбуе не да такой ступені, каб прымаць нейкія актыўныя захады.

І найбольшы іспыт будзе для арганізаваных частак грамадства. Гэта і палітычныя партыі, і грамадскія аб'яднанні, і прадпрымальніцкія структуры.

Апошнія сёння ў цэнтры ўвагі. Гульня насамрэч яшчэ далёка не скончаная. Яна не будзе скончаная нават у тым выпадку, калі прадпрымальнікі суцішацца. Бо чакаць чарговых захадаў з боку ўлады, якая ставіцца да "торгашей" з усёй пралетарскай нянавісцю, доўга не давядзецца.

Урэшце гэтае становішча ўсё адно давядзецца змяняць. Дык чаму не тут і не цяпер?..

Маўчыць Беларусь. Не дае адказу. Прынамсі, пакуль.

**Валеры Філін**

## Нам пішуць

Дзяржаўныя чыноўнікі назапасілі вельмі вялікія грошы і хочуць стаць дзяржаўнымі капіталістамі. Пры гэтым яны не ўкладваюць свае капіталы ў разваленыя імі ж заводы, фабрыкі і калгасы, а заклікаюць кагосьці будаваць заводзікі ў голай вёсцы. А самі захопліваюць гандаль — клопатаў меней, даход хутчэйшы, а затым і падаткі сабе знізяць. Ну, не будуць жа яны працаваць як ІП у такіх умовах. І законы памяняюць, і будзе ў многіх з іх сямейны бізнес-камора.

**Яўген**

Гаспадыня

# "ВАС ПАБУДЗЯЦЬ СПЕВЫ ПТУШАК"

## ПРАЎДА ПРА БЕЛАРУСКІХ ГАСТАРБАЙТЭРАЎ

Брыгада беларускіх будаўнікоў з сямі чалавек накіравалася на працу у Расію… Працавалі на будаўніцтве ў падмаскоўным пасёлку, катэджы ў якім у інтэрнэце рэкламуюцца для патэнцыйных пакупнікоў слоганам "Вы прачнецеся на ўзлеску. Вас пабудзяць спевы птушак".

Была вясна. Травень. І птушкі сапраўды спявалі, калі а палове на сёмую ў абсталяваным нарамі пакойчыку недабудаванага катэджа прачыналіся рабочыя, каб прыгатаваць сабе сняданак. Па прадукты ў краму, якая знаходзілася на ўзлеску, хадзілі, як партызаны, таму што каля крамы "пасліся мянты", якія, нават не пытаючыся пра рэгістрацыю, адразу забіралі грошы. На гэты выпадак у кішэні заўсёды трэба было трымаць сто расійскіх рублёў, бо калі будзе болей, забяруць усе. Таму будаўнікі адразу залягалі ў лесе і глядзелі, калі з'едуць служкі закону, і можна будзе здабыць сабе ежу.

Працавалі ад восьмай раніцы да восьмай вечара. Праз тры месяцы прыйшоў час вяртацца дахаты, прыйшоў час разліку. Грошы маскоўская пасярэдніцкая кантора выплаціла толькі за месяц, астатняе павінны былі выплаціць пасля, калі "прададуцца катэджы", "зараз такіх грошай няма".

Людзі выехалі, а назад на будоўлю ў Расію вярнуліся тры чалавекі – брыгадзір і два ягоныя сябры. Вырашылі, што больш людзей там не трэба. Заробак астатнім абяцалі выслаць у Беларусь.

Ішоў час. Грошай не было. За гэты час аднаго будаўніка паспела зарэзаць жонка – мабыць, за безграшоўе…

Пасля аказалася, што ўсе заробленыя грошы атаварания брыгадзірам у расійскіх магазінах "Эльдарада" – была закуплена электратэхніка, а таксама дарагая вялікая лядоўня. Свой заробак будаўнікам давялося выбіваць у літаральным сэнсе гэтага слова, а больш сціплыя засталіся без грошай. Без грошай засталася і сям'я таго, якога зарэзала за безграшоўе жонка. А каму былі патрэбныя грошы? Ён у магіле, жонка ў турме, дзіцёнак – дык яму ж 10 гадоў, ён не будзе "наязджаць", патрабаваць сваё.

Пытанняў шмат… Чаму свае дураць сваіх? Ці ўся справа ў грошах? Дзе грошы, там і падман? Няўжо салідарнасць (хаця бы працоўная) не для беларусаў? Колькі каштуе лядоўня, калі за яе можна прадаць людзей, якія працавалі з табой разам і табе давяралі? Ці магчыма абараніць правы людзей, якія выязджаюць на заробкі? Сам факт існавання беларускіх гастарбайтэраў супярэчыць іміджу Беларусі як эканамічна развітай краіны, дзе быццам бы ўсе людзі маюць добрую працу і годнае жыццё.

Сёння, паводле ацэнак расіян, у Расіі працуе каля 300 тысяч беларусаў. Паводле звестак міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі, плынь беларускіх грамадзянаў, якія выязджаюць за мяжу на заробкі без рэгістрацыі сваёй занятасці, падзяляецца наступным чынам: 83,8% едуць ў Расію, астатнія 16,2% шукаюць працу ў краінах Балтыі, Польшчы, Чэхіі, Германіі і г. д. І ў той жа час кіраўнік дзяржавы адмаўляе наяўнасць беларускіх гастарбайтэраў: "Вы калі-небудзь чулі, што ў Маскве гастарбайтэрамі ўладкоўваюцца беларусы і там пакутуюць?"— заявіў ён на 3-м Усебеларускім сходзе перад апошнімі выбарамі. – Ад нас людзі не едуць на нейкія заробкі наёмнымі рабамі, – гэта паказальнік таго, што ў нас работа ёсць свая, у доме нашым. Гэта паказальнік развіцця".

**Паліна Качаткова**

# НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГЕРОЙ РАСІІ

Саюздрук

## АЛЬБО ЧАМУ Б ІП-ШНІКАМ НЕ ПРАВЕТРЫЦЦА?

У "Советской Белоруссии" Ігар Славінскі піша пра прызначэнне Віталя Калоева намеснікам міністра будаўніцтва і архітэктуры Паўночнай Асеціі.

*"Трагический вираж жизнь Виталия Калоева совершила 2 июля 2002 года в два часа ночи по московскому времени. В небе над Боденским озером в Германии столкнулись российский Ту–154 и грузовой «Боинг». В этой страшной авиакатастрофе погибла вся семья Калоева — жена, маленькие сын и дочка. Калоев убил швейцарского диспетчера, ответственного за аварию, отсидел три года в тюрьме Цюриха и совсем недавно, перед Новым годом, вышел на свободу.(...)*

*Да, с формальной стороны предложение, поступившее Калоеву, вполне логичное: до трагических событий он имел собственную строительную фирму. А вот с юридической точки зрения все не слишком однозначно. «Статья 16 федерального закона «О государственной гражданской службе» не позволяет находиться на госслужбе лицам с неснятой судимостью, — считает адвокат российской Инюрколлегии Владимир Тымков. — Но в России Калоев не считается судимым. Если бы он отбывал наказание в России, тогда другое дело»... Однако, стоит ли так удивлять цивилизованный мир? Или – знай наших?.."*

Замест таго, каб падзякаваць швейцарцам, у Расіі Калоеву наладжваюць шыкоўную сустрэчу ў Маскве – з нацыянальнымі сцягамі, шампанскім, крыкамі "ўра" ды ўспышкамі фотакамер. Нацыянальны герой Расіі. Цікава, чаму Калоеў не зарэзаў разам з бацькам і дзяцей? Ці жонку? Пасля такой помсты, можа, адразу б у міністры выйшаў? Але не думаю, што цывілізаваны свет яшчэ здзіўляецца падзеям у Расіі.

Уладзімір Васількоў у газеце"7 дней" каментуе апошнія выступленні прадпрымальнікаў, нязгодных губляць свой бізнес.

*«А был ли мальчик?»… То есть, а был ли протест предпринимателей?.. Протест, конечно, был, но совсем не того размаха, который предварительно разрекламировали СМИ определенного круга. Нелишне будет напомнить, что январь традиционно является месяцем затишья в предпринимательской деятельности. Работы у ИП-шников сейчас объективно меньше, свободного времени больше — так почему же не сходить на проспект, не проветриться… Ну да ладно — так или иначе, свой протест индивидуалы выразили довольно вяло, всю «работу» в данном случае за них почему-то делали более «харизматичные» лидеры вроде Лебедько, Калякина и агрессивно настроенные студенты. Почему бизнесмены настолько небрежно относятся к собственной репутации, впуская в свои ряды такую дешевую политмассовку, — понять трудно. Не совсем понятно также, например, какими мотивами руководствуется считающий себя коммунистом Сергей Калякин, когда выходит на площадь защищать право ИП-шников нанимать рабочих — то есть ту самую эксплуатацию человека человеком, так ненавистную марксизму, тем более в его коммунистическом варианте…*

*Понятное дело, та налоговая халява, которая существовала до вступления в силу указа №760, была для ИП, как говорится, приятной мелочью, от которой так не хочется отказываться! Но не все коту масленица".*

Перакрыць галоўны праспект сталіцы на некалькі гадзінаў – гэта "сходить проветриться"? Што ж трэба зрабіць прадпрымальнікам, каб спадар Васількоў да глыбіні душы ўразіўся? Цікава было б пачытаць тлумачэнні аўтара, чаму ў "чаўнакоў" тавары таннейшыя, чым у дзяржаўным гандлі? А яшчэ да слёз расчульвае клопат аўтара пра "экспуатуемых". Няшчасныя, напэўна, так запрацаваліся, што не бачаць ні свету белага ні "7 дней". Нічога не ведаюць пра "аграгарадкі з заробкамі ў 800 даляраў".

А яшчэ ў газеце "7 дней" Святлана Волкава піша пра небяспеку, якую нясе Інтэрнэт беларускім дзеткам.

*"Посещая множество нужных и полезных сайтов, ваш ребенок может наткнуться и на очень неожиданные ресурсы, заполненные содержимым эротического и порнографического характера. Кроме того, он может начитаться обсуждений и рассказов старших о «чудесных» пьянках-гулянках и много о чем еще. Да что говорить, если даже на портале для школьников «ШколаBY» я наткнулась на 5 ссылок, посвященных алкогольной продукции, а также на новость о том, что денверские беременные школьницы требуют декретного отпуска и пособия! Вся эта гадость бессознательно влезает в головы ваших детей. И это только начало. Ведь есть еще и различные религиозные и сатанинские секты. А нынче все они считают просто необходимым иметь свою страничку в Интернете.*

Дзякуй мужнай журналістцы, якая не пабаялася назваць рэчы сваімі імёнамі. "ШколаBY" – гэта сапраўды брыдота, да якой нельга падпускаць нашых дзяцей. Але ж навошта ганіць усё павуцінне? Акрамя БРСМ і парнаграфіі, у інтэрнэце ёсць шмат чаго цікавага. Напрыклад, сайт "Советской Белоруссии". Ці газеты "Свабода".

**Алесь Канюціч**

# САКРЭТНЫЯ ПЛАНЫ

Як робяцца хвалі

## АЛЬБО ШТО БУДЗЕМ РАБІЦЬ НА ДЗЕНЬ ВОЛІ?

Радыё звычайна паведамляе, што адбываецца ці адбылося. А вось каб больш увагі надавалася тым падзеям, што яшчэ толькі маюць адбыцца. Можа, тыя падзеі тады б рыхтаваліся і адбываліся больш плённа. Вось, скажам, Дзень Волі. Усе ведаюць, што прыйдзе 25 сакавіка. А што адбудзецца ў гэты дзень? Як яго адзначаць палітычныя, грамадскія арганізацыі? А навукоўцы, а мастакі-літаратары? І толькі журналісты могуць смела пахваліцца, што дакладна ведаюць, што будуць рабіць у гэты дзень. Яны напішуць рэпартажы, пакрытыкуюць, калі што было не так. Дык вось жа паўтару думку – можа, калі загадзя наладзіць абмеркаванне, сппланаваць яго падрыхтоўку, дык і бляклых вынікаў будзе меней.

Мне могуць запярэчыць – маўляў, гэта сакрэтныя планы. Каб улады не перашкодзілі. Тут, праўда, узнікае другое пытанне – а навошта планаваць тое, што немагчыма рэалізаваць з-за супраціву ўладаў ці з-за недахопу сродкаў і сілаў?

Дык што будзем рабіць на Дзень Волі?

Тэхнічныя заўвагі. Назіранні на частаце 612 Кгц. Калі на Еўрарадыё нешта кліняць і няма трансляцыі праграмы, то ўключаецца джаз, калекцыя сімпатычных такіх мелодыяў. А вось што было на працягу ўсяго мінулага тыдня з трансляцыяй Радыё Рацыя. Гучыць сігнал, вядучы кажа, што ў эфіры Рацыя, на працягу бліжэйшай гадзіны вы пачуеце... І далей цішыня, цэлую гадзіну. Калі гэта творчая задума рэдакцыі, дык яе трэба ўхваліць. Калі ўвесь час таўчэшся на людзях, дык і гаварыць няма пра што. Бывае, трэба пабыць аднаму і памаўчаць.

**Сяржук Вітушка**

Стрэмкі

# ПРЫГОДЫ РЭАЛІЗМУ

## МАСТАЦТВА ДЛЯ ТЫХ, ХТО МАЕ АДВАГУ ДУМАЦЬ

У мастакоў майго пакалення, якое сталела пры бальшавіках, стойкая алергія на рэалізм. “Рэалізм” – гэта выставы “Мы будуем камунізм” – з партызанамі, даяркамі ды перадавікамі сацыялістычнага спаборніцтва.

Але ўжо ўвайшло ў жыццё пакаленне, якое не ведае, хто такі “дзедушка Ленін”, а абрэвіятура БАМ для яго – пусты гук. Увогуле, змяніўся кантэкст, у якім існуе мастацтва. Стравінскі некалі сказаў: “мастацтва – гэта рамонт старых караблёў”. Паціху, спакваля мяняюцца і адносіны да рэалізму.

Калі не гуляць мастацтвазнаўчымі тэрмінамі, то рэалізм – падмурак, хрыбетнік усяго выяўленчага мастацтва, ад наскальных малюнкаў да фрэсак Мікелянджэла і Рыверы. Сапраўды, выяўленчае мастацтва ўзнікла з патрэбы зафіксаваць убачанае, перажытае ды пераказаць гэтыя вобразы іншым. А паколькі бачым мы не проста колеры, аб’ёмы і лініі, а прадметы, прадметным з’яўляецца і мастацтва, народжанае першасным шчырым імпульсам – ці то ў першабытнага паляўнічага ці ў дзіцяці або ветэрана-аматара. Самыя заўзятыя “авангардысты” ў дзяцінстве малявалі домікі, сонейка і птушак.

Прафесійны мастацкі рэалізм – справа складаная. Нездарма ёй трэба вучыцца так доўга – гадоў 5-6 у мастацкай школе ды яшчэ столькі ж у акадэміі.

У наш час мастацтва малявання выцеснена мастацтвам стварэння “праектаў”, дзе маляваць не абавязкова, а найчасцей і зусім не трэба. Мне заўсёды здавалася наіўным перакананне прафесараў Беларускай акадэміі мастацтваў, што найперш абавязкова трэба як след навучыцца маляваць, а потым рабі што хочаш. Не магу дапяць, на халеру дванаццаць гадоў маляваць гіпсавых Давідаў і пасінелых натуршчыц, каб потым заліваць бетонам выставачныя залы або запырскваць фарбаю прыступкі? Але гэта трохі іншая тэма.

Цэлых сто гадоў рэалізм ва ўсім свеце, за выключэннем СССР, быў у “андэрграўндзе”. Але гэта не быў underground “бульдозерных выставаў”, што існавалі пры бальшавіках. Не заплеснелыя сутарэнні і дзіравыя гарышчы, а раскошныя інтэр’еры багатых асабнякоў. Рэалізм усё больш становіцца мастацтвам для знаўцаў, гурманаў, якія могуць адрозніць сапраўдны твор ад самаробнай фальшыўкі “пад старых майстроў”. Гэта і глядзець самастойна, не звяртаючы ўвагі на крытыкаў і куратараў.

Нядаўна па віленскіх майстэрнях хадзіў японец – шукаў рэалістычных твораў. Бо ў Еўропе рэалізм настолькі рэдкі і настолькі дарагі, што купіць немагчыма. Невядома, ці ён што знайшоў – мастацкая віленская школа цяпер выпускае майстроў “праектаў”.

У Беларусі мастацкая школа захавалася пры бальшавіках, як маманты ў вечнай мерзлаце. Захад са здзіўленнем і захапленнем адкрывае сваіх забытых мастакоў – Клімта, Сарджэнта, Муху, дойдзе чарга і да Андэрса Цорна, Ігнасіа Сулаагі ды іншых.

Можна лічыць гэта іроніяй гісторыі, шчасцем у няшчасці – але мы, адстаўшы ад усяго свету на цэлы круг, у сэнсе мастацкай школы апынуліся нароўні, а можа і трошкі наперадзе ад астатніх!

Грэх гэтым не пакарыстацца. Гэты момант – кароткі. Нядаўна я бачыў каталог адной нідэрландскай групы мастакоў-рэалістаў. Усё ёсць – прафесіяналізм, традыцыя, густ, узровень. Гады нараджэння сяброў групы – 1970-я. Для мастацтва гэта – моладзь.

Пакуль нас зноў не апярэдзілі, мы павінны заявіць пра сябе ўсяму свету. У ідэале гэта было б міжнароднае Біенале рэалізму. Але гэта – супердарагі праект. Магчыма, пакуль можна было б абмежавацца пераглядам таго, што маем самі – цыкл персанальных выставаў “Выпрабаваныя каштоўнасці. Рэалізм новага часу”. А паказваць ёсць каго: Алесь Мемус (Віцебск), Валеры Шкаруба, Кастусь Качан, Барыс Казакоў... Дыскусіі, артыкулы, спрэчкі, каталогі. Але пра гэта павінна падумаць новае кіраўніцтва Саюзу мастакоў.

**Алег Аблажэй**

## Фотафакт



**Купанне на Вадохрышча.**
*Мінск, 19 студзеня 2008 году.*

## Невядомая Беларусь

**24 студзеня** 1911 году памёр Аляксандр Аскерка, удзельнік паўстання Каліноўскага. Нарадзіўся ён у маёнтку Рудакоў пад Хойнікамі, скончыў Пецярбурскі ўніверсітэт. Аскерка выдаў у Варшаве беларускі каляндар-катэхізіс. У паўстанні быў адным з лідэраў партыі «белых». Яго арыштавалі і выслалі на катаргу ў Сібір. Праз дзесяць гадоў ён вярнуўся ў Варшаву і там рэдагаваў часопіс Ateneum. Пасля дваццаць гадоў Аскерка жыў у Вільні, а памёр у Відзах на Браслаўшчыне, дзе і пахаваны.

**26 студзеня** 1990 году Вярхоўны Савет Беларускай ССР прыняў Закон аб Мовах. Адзінай дзяржаўнай мовай называлася беларуская, якой — цытую — “забяспечваецца ўсебаковае развіццё і функцыянаванне ва ўсіх сферах грамадскага жыцця”. Расійская мова называлася мовай міжнацыянальных зносін народаў СССР. Але пасля рэферэндуму 1995 году расійскай мове быў нададзены статус другой, а фактычна першай дзяржаўнай, і выкананне Закону аб мовах было спынена.

**27 студзеня** 1913 году адбылася першая пастаноўка знакамітай п’есы Янкі Купалы «Паўлінка». У Вільні сіламі Беларускага музычна-драматычнага гуртка паставіў п’есу Алесь Бурбіс.

**30 студзеня** 1667 году – важная дата ў гісторыі Беларусі. Гэта дзень Андрусаўскага замірэння, паводле якога Смаленск назаўсёды адыйшоў ад беларускіх земляў да Расіі. Камісары Вялікага Княства, з аднаго боку, і расійскія царскія паслы, з другога, у вёсцы Андрусава, што паміж Смаленскам і Мсціславам, падпісалі дамову аб замірэнні тэрмінам на 13 з паловай гадоў. Так закончылася самая стратная ў гісторыі Беларусі вайна, у якой загінуў кожны другі.

Блакітны агеньчык

# НЕ СВАІМ ГОЛАСАМ

## КІРАЎНІК ДЗЯРЖТЭЛЕРАДЫЁ ЗАНЕПАКОЕНЫ БЕЛСАТАМ

Нядаўняя інтэрнэт-канферэнцыя на Радыё Свабода кіраўніка інфармацыйных праграм тэлеканала БелСат Аляксея Дзікавіцкага выклікала непадробную цікавасць. (Газета "Свабода" у мінулым нумары надрукавала некаторыя яго адказы на пытанні беларускіх слухачоў.) Зацікавілася інфармацыяй пра тэлевяшчанне на Беларусь з-за мяжы не толькі шырокая публіка, але й высокае начальства.

Сам старшыня Нацыянальнай дзяржтэлерадыёкампаніі РБ Аляксандр Зімоўскі звярнуў на яе ўвагу. Узнагароджаны на пачатку году ордэнам Францыска Скарыны, вядомы ў мінулым тэлевядоўца натхніўся, прачытаўшы "нататку на Свабодзе " (цытата) і адправіў эпісталу ў "Беларускія Навіны" – на сайт naviny.by. Цікава, што кіраўнік дзяржтэлерадыё палічыў патрэбным выказаць сваё "фэ" не на БТ ці ў "Советской Белоруссии", скажам, а на сайце недзяржаўнага інфармацыйнага агенцтва БелаПАН.

Сутнасць прэтэнзіі вельмі простая. Дзікавіцкі, адказваючы на пытанне, чаму праграмы БелСата дагэтуль не ідуць на спадарожніку Sirius, як было раней абяцана, сказаў, што "праблемы звязаныя сярод іншага з канфліктам гэтага спадарожніка са спадарожнікам Hotbird".




**Аўтамашына 1-га каналу** *(БТ) у цэнтры Мінска. Студзень 2008 году.*

І Зімоўскі, які сам сябе называе "мацёрым прапагандыстам", з задавальненнем выкрывае няўдалае выказванне свайго маладзейшага калегі па тэлевізійным цэху. У доказ таго, што спадарожнікі ніяк не замінаюць адно аднаму, у "нататцы" на сайце надрукаваная карта вяшчання "Сірыюса"-4 на краіны Еўропы і Міжземнамор'я. Мацёры прапагандыст выказвае здагадку, што ў кампаніі БелСат, відаць, не ўсё ў парадку з фінансамі. Радасць яго можна зразумець.

Не зусім зразумела, праўда, дзеля чаго дзяржаўнаму чыноўніку спатрэбілася пярыць незалежную тэлекампанію, ды яшчэ бясплатна? Магчыма, прычына ў тым, што яшчэ больш высокае начальства занепакоенае, што БелСат зможа, у выпадку поспеху, даносіць аб'ектыўную інфармацыю да гледачоў у Беларусі і тым самым скласці сур'ёзную канкурэнцыю дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі РБ? Адказ на гэтае пытанне можа даць, зразумела, толькі сам БелСат. І чым хутчэй ён пачне вяшчаць у поўным аб'ёме – тым лепш для гледачоў, у якіх упершыню з'явіцца альтэрнатыва тэлебачанню Зімоўскага.

А што да ўзроўню дзяржаўнай прапаганды…Нядаўна давялося сутыкнуцца з наватарствам у гэтай галіне. 21 студзеня на Кастрычніцкай плошчы ў Мінску на мітынг сабраліся прадпрымальнікі. Каб заглушыць аратараў, на ўсю моц былі ўлучаныя рэпрадуктары. Па першай праграме дзяржаўнага радыё акурат распавядалі пра тое, як добра стала жыць беларусам, дзякуючы новаму закону аб упарадкаванні льготаў. Эфект атрымаўся гумарыстычны…

Можа, варта паставіць рэпрадуктары каля кожнага дому і ўрубіць радыё на 24 гадзіны ў суткі? Тады праблемы прагляду БелСата, а таксама праслухоўвання Радыё Свабода знікнуць самі сабою.

**Максім Пешка**

КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ АТРЫМЛІВАЦЬ СВАБОДУ ПРАЗ ПОШТУ, ДАШЛІЦЕ ВАШ ПОЎНЫ І ДАКЛАДНЫ АДРАС ( ВУЛІЦА, ДОМ І КВАТЭРА, ІНДЭКС, ГОРАД, РАЁН, ВОБЛАСЦЬ) SMS-ПАВЕДАМЛЕННЕМ НА НУМАР +370 687 42185 АЛЬБО НА E-MAIL: EDIT@VILNIA.COM

КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ ЧЫТАЦЬ СВАБОДУ Ў ІНТЭРНЭЦЕ І Ў PDF-ВЕРСІІ, ЗАХОДЗЬЦЕ НА САЙТ WWW.SVABODABY.NET

КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ АТРЫМЛІВАЦЬ PDF-ВЕРСІЮ СВАБОДЫ, ПАВЕДАМЦЕ НАМ НА E-MAIL EDIT@VILNIA.COM ВАШ ЭЛЕКТРОННЫ АДРАС.

**Заснавальнік** ТАА "Тут і цяпер" **Тыраж** 299 экзэмпляраў
**Галоўны рэдактор** А. Уласаў (email: edit@vilnia.com) **Падпісана ў друк** 24.1.2008 23:54
**Адрас** 220013 г. Мінск, вул.Касцюшкі 18